**Л. С. Кныш**

# ГАВАРЭННЕ ЯК СКЛАДНІК НАВУЧАННЯ БМЗ : СЯРЭДНІ ЎЗРОВЕНЬ (В1)

Нароўні з граматыкай, чытаннем, пісьмом, аўдыяваннем г а в а р э н н е з'яўляецца адным з асноўных складнікаў пры навучанні беларускай мове як замежнай. “Гаварэнне – вусны прадуктыўны від маўленчай дзейнасці, з дапамогай якога ажыццяўляецца вусная форма зносін з мэтай устанаўлення і падтрымання кантакту, уздзеяння, выражэння эмацыянальнага стану і г.д.”. [Гайсёнак В. А.] Гаварэнне – самы складаны з відаў маўленчай дзейнасці: па сутнасці, усё чаму навучаецца ў курсе БМЗ, робіцца дзеля таго, каб навучыць гаварыць. Механізм гаварэння:

- Матыў: *што я хачу? Навошта я буду гаварыць?*
- Намеры (інтэнцыя): *якім чынам я дасягну мэты, ведаючы субяседніка і сітуацыю?*
- Моўныя, маўленчыя і невербадьныя сродкі*: якія словы, фразы, жэсты і г.д. я буду выкарыстоўваць?*
- Канчатковая мэта.

Г а в а р э н н е – гэта такі від маўленчай дзейнасці, які рэалізуецца тады, калі ў свядомасці моўцы ўзнікае патрэба ў маўленчым уздзеянні на субяседніка. Гаварэнне можа суправаджаць якую-небудзь іншую дзейнасць (напрыклад, працоўную, вучэбную) або быць самастойным відам маўленчай

дзейнасці (напрыклад, пры выступленні з дакладам, лекцыяй і г.д.). Такім чынам, гаварэнне як від маўленчай дзейнасці мае месца, калі ў чалавека ўзнікае камунікатыўная патрэба, жаданне выйсці ў камунікатыўнае ўзаема-дзеянне і дасягнуць пэўнай мэты. [Под ред. А. Н. Щукина.]

Гаварэнне можа ажыццяўляцца ў форме д ы я л о г у і м а н а л о г а.

Дыялагічная і маналагічная формы маўлення маюць свае адрозненні.

Д ы я л а г і ч н а е маўленне (грэч. *dialogos* – бяседа, размова дваіх), або дыялог:

– форма маўлення, якая складаецца з абмену выказваннямі-рэплікамі, на моўны склад якіх уплывае непасрэднае ўспрыманне, якое актывізуе ролю слухача ў маўленчай дзейнасці моўцы.

– складаецца з чаргавання кароткіх рэплік моўцаў, калі ўдзельнікі камунікавання паперамeнна выступаюць то ў ролі моўцы (перадача інфар-мацыі), то ў ролі слухача (прыём інфармацыі);

– узнікае на базе сітуацыі. Задача – вырашыць нейкую (пэўную) праблему;

– дыялог кантэкстуальны: кожнае наступнае выказванне шмат чым абумоўлена папярэднім;

– фарміруецца спантанна, логіку разгортвання дыялогу не заўсёды можа быць прадугадаць, бо яна залежыць ад рэакцыі моўцы.

– больш элементарны па сваіх структурных характарыстыках, для яго ўласцівы эмацыянальная і мадальная афарбаванасць, і гэта адлюстроўваецца ў форме выражэння: эліпсіс, інтанацыя, перастаноўка слоў, частак фразы.

М а н а л а г і ч н а е маўленне (грэч. *monologos* – адзін і слова, маўленне), або маналог:

– форма маўлення, якая ўтвараецца ў выніку актыўнай маўленчай дзей-насці моўцы і якая разлічана на ўспрыманне маўлення слухачом / слухачамі;

– складаецца з больш разгорнутага тыпу маўлення моўцы, які будуе яго з разлікам на разуменне слухачом/слухачамі;

– узнікае ў выніку пастаноўкі якой-небудзь праблемы і неабходнасці данесці яе да слухача;

– будуецца моўцам па асабістай праграме: прадмет гаворкі, апісанне сітуацыі і г.д.;

– разгортваецца па тэме, раскрывае яе змест; моўца самастойна будуе праграму выказвання;

– больш арганізаваны і завершаны ў структурна-сэнсавых адносінах.

Маналог, як і дыялог, прадугледжвае наяўнасць слухача, які можа рэакцыяй, жэстам, мімікай перарваць маналагічнае маўленне, а далей вуснае камунікаванне можа працякаць у форме дыялогу. Але ва ўмовах непасрэдных вусных камунікатыўных зносін даволі часта сустракаецца дыялог з элемен-тамі маналагічнага маўлення і маналог з элементамі дыялагічнага маўлення. Гэта мае значэнне калі, рашаецца пытанне аб тым, чаму вучыць спачатку: дыялогу ці маналога.

Навучанне дыялогу і маналога павінна быць узаемазвязана і ісці паралельна. Дынаміку развіцця як дыялогу, так і маналога вызначае расшырэнне тэматыкі, выкарыстанне ўсё больш складаных структур, павелічэнне аб'ёму выказвання. [Л. С. Крючкова]

Для ўзровеню В (В1, В2) (у адпаведнасці са стандартам валодання беларускай мовай як замежнай) прадугледжваецца [Гайсёнак В. А.]:

Мэта задання:

- Рэагаванне з ацэнкай (з захаваннем нормаў маўленчага этыкету);
- Ініцыяванне мадальнага дыялогу (просьба, парада, жаданне);
- Гутарка па тэксце;
- Маналог на зададзеную тэму.

Тып заданняў:

- Адказ на рэплікі па зададзенай сітуацыі (5рэплік);
- Ініцыяванне дыялогу (5 сітуацый, падмацаваныя відэазапісам);
- Тэматычная гутарка па тэксце (аб'ём тэксту – 700 слоў);
- Тэматычная гутарка (да 10 хвілін).

Прыкладныя выніковыя заданні:

**Частка 1. Дыялагічнае маўленне (непадрыхтаванае). Рэагаванне з заха-ваннем маўленчага этыкету.**

**Заданне.** Прыміце ўдзел у дыялогу без папярэдняй падрыхтоўкі. Адкажыце на пытанні. Памятайце, што вы павінны даць поўны адказ.

*– Прывітанне, Макс. Пазнаёмся. Гэта мой брат Васіль. Ён студэнт медыцынскага ўніверсітэта і даўно хоча пазнаёміцца з табою. Раскажы яму пра сябе.*

**– ….**

**Частка 2. Дыялагічнае маўленне. Ініцыяванне мадальнага дыялогу.**

**Заданне.** Пазнаёмцеся з апісаннем сітуацыі. Пачніце дыялог без падрыхтоўкі.

*Вы схадзілі ў тэатр. Вас перапаўняюць эмоцыі і ўражанні. Раскажыце пра гэта вашаму сябру. Што вы глядзелі, дзе былі, што вам спадабалася.*

**– ...**

**Частка 3. Дыялагічнае маўленне. Рэагаванне.**

**Заданне. Прачытайце рэплікі і выкажаце свае рэакцыі:**

Ваша сяброўка нарэшце знайшла кватэру, куды вы можаце пераехаць жыць. Адрэагуйце на яе навіны:

*Выкажаце радасць:*

– Я магу цябе парадаваць. Нарэшце я знайшла для цябе кватэру.

– …

*Выкажаце здзіўленне:*

– Кватэра знаходзіцца ў цэнтры горада каля ўніверсітэта.

– …

*Выкажаце незадавальненне:*

– Але плаціць за яе давядзецца нямала: 300 долараў за месяц.

– …

**Частка 4. Маналагічнае маўленне на зададзеную тэму / сітуацыю.**

**Заданне. Пазнаёмцеся з апісаннем сітуацыі. Выкажаце свае думкі, адкажыце на пытанні.**

**Сітуацыя:**

Ваша сяброўка вельмі любіць жывёл. У яе ёсць кот і сабака. Сяброўка паглядзела перадачу пра вытворчасць мясных прадуктаў. Яна перастала есці мяса і рыбу. Яна схуднела. У яе дрэнны апетыт і дрэнны настрой. Яна есць толькі кашу, гародніну і садавіну.

- Што Вы параіце сваёй сяброўцы?
- Як можна збалансаваць рацыён?
- Чым можна замяніць мяса і рыбу?

**Частка 5. Маналагічнае маўленне на зададзеную тэму.**

**Заданне**: Паглядзіце на малюнак (2 хвіліны). Раскажыце пра ўсё, што вы на ім бачыце.

